Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Вучэбна-метадычнае аб’яднанне вышэйшых навучальных устаноў
Рэспублікі Беларусь па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы намеснік
Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
_________________ А.І. Жук
“___” ______________ 2010 г.
Рэгістрацыйны № ТД-____/ тып.

# КЛАСІЧНЫ ТАНЕЦ

*Тыпавая вучэбная праграма для вышэйшых навучальных устаноў*
*па спецыяльнасці 1-17 02 01 Харэаграфічнае мастацтва (па напраках)*
*напрамкі спецыяльнасці*
*1-17 02 01 04 Харэаграфічнае мастацтва (народны танец)*
*1-17 02 01 05 Харэаграфічнае мастацтва (бальны танец)*
*1-17 02 01 06 Харэаграфічнае мастацтва (эстрадны танец)*

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік упраўлення
навучальных устаноў і
работы з творчай моладдзю
Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
___________ Н.Ю.Шмакава
“___” ___________2010 г.

Старшыня Вучэбна-метадычнага
аб’яднання вышэйшых навучаль-
ных устаноў Рэспублікі Беларусь
па адукацыі ў галіне
культуры і мастацтваў
______________ Б.У.Святлоў
“____”____________ 2010 г.

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік упраўлення вышэйшай
і сярэдняй спецыяльнай адукацыі
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
_____________ Ю.І.Міксюк
“____” ____________2010 г.

Рэктар дзяржаўнай установы
адукацыі “Рэспубліканскі інстытут
вышэйшай школы”
_____________ М.І. Дзямчук
“____” ______________ 2010 г.

Эксперт-нормакантралёр
_________________
“____”_______________ 2010 г.

Мінск 2010

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Складальнік**

*Н.У.Карчэўская,* дацэнт кафедры харэаграфіі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат мастацтвазнаўства

**Рэцэнзенты:**

кафедра харэаграфіі ўстановы адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі”;

*В.Саркісьян,* прафесар, народны артыст Беларусі

**Рэкамендавана да зацвярджэння ў якасці тыпавой:**

*кафедрай* харэаграфіі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 9 ад 27.05.2008 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 6 ад 12.05.2009 г.);

*секцыяй* харэаграфіі навукова-метадычнага савета па мастацтве музыкі Вучэбна-метадычнага аб’яднання вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў (пратакол № 1 ад 29.08.2009 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: *В.В.Каташвілі*
Адказны за выпуск: *Н.У.Карчэўская*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна “Класічны танец” з’яўляецца адной з вызначальных у прафесійным навучанні будучых спецыялістаў у галіне танцавальнага мастацтва. Курс разлічаны на пяць гадоў навучання і спалучае тэарэтычныя і практычныя заняткі.

Праграма вучэбнага курса “Класічны танец” распрацавана на аснове вопыту работы выкладчыкаў кафедры харэаграфіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў у адпаведнасці з адукацыйным стандартам.

Сістэма навучання класічнаму танцу ляжыць у аснове выканальніцкага майстэрства ва ўсіх відах танца. Школа класічнага танца дазваляе значна палегчыць аваладанне тэхнікай іншых танцавальных жанраў, у прыватнасці народнага, эстраднага і бальнага танца. Курс “Класічны танец” з'яўляецца той асновай, якая дае магчымасць з поспехам засвоіць сучасную методыку выканання і стварэння харэаграфічнага твора любога жанру. Вучэбная дысцыпліна “Класічны танец” выкладаецца ў цесным супрацоўніцтве педагогаў класічнага, народнага, эстраднага і бальнага танца, па мастацтве балетмайстра, гісторыі харэаграфіі і аналізу харэаграфічнага твора, майстэрству акцёра, сцэнічнаму афармленню танца і касцюма, а таксама іншых спецыяльных дысцыплін.

Асноўнай мэтай прадмета “Класічны танец” з'яўляецца падрыхтоўка выканаўцаў, педагогаў, кіраўнікоў харэаграфічных калектываў са сфарміраванымі навыкамі і практычнымі ўменнямі ў сферы класічнага танца.

Праграма прадугледжвае засваенне студэнтамі матэрыялу на лекцыйных, лабараторных і індывідуальных занятках, на якіх вырашаюцца наступныя *задачы курса:*

– азнаямленне з гісторыяй узнікнення і развіцця класічнага танца;

– развіццё і ўдасканаленне выканальніцкіх навыкаў у сферы класічнага танца;

– развіццё артыстычнасці;

– вывучэнне методыкі пабудовы і правядзення ўрока класічнага танца, прынцыпаў падбору музычнага афармлення ўрока;

– вывучэнне спецыфікі выкладання класічнага танца ў харэаграфічных калектывах розных кірункаў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– авалоданне навыкамі паказу, тлумачэння і запісу асобных рухаў і камбінацый, правядзення пад кіраўніцтвам педагога часткі і цэлага ўрока з далейшым аналізам;

– набыццё практычных уменняў і навыкаў стварэння асобных танцавальных камбінацый, эцюдаў, варыяцый і іх апрацоўкі.

Змест курса прадстаўлены ў тэматычным плане.

Сярод эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія спрыяюць актывізацыі вучэбнай дзейнасці студэнтаў, набыццю імі асабістага вопыту вырашэння творчых задач, трэба выдзеліць:

– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;

– праектныя тэхналогіі;

– метад аналізу канкрэтных сітуацый.

Для аптымізацыі навучальнага працэсу і арганізацыі эфектыўнай кантрольна-ацэначнай дзейнасці педагогам належыць выкарыстоўваць рэйтынгавыя сістэмы ацэнкі дзейнасці, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы, вучэбна-метадычныя комплексы.

Лекцыйны матэрыял знаёміць студэнтаў з асноўнымі этапамі развіцця сістэмы класічнага танца, методыкай пабудовы і правядзення ўрока класічнага танца, музычным афармленнем урока і развіццём музыкальнасці на ўроках класічнага танца, са спецыфікай працы ў калектывах розных харэаграфічных жанраў. Тэарэтычны курс таксама ўтрымлівае звесткі аб найбольш вядомых выканаўцах, балетмайстрах і педагогах.

На лабараторных (практычных) занятках адпрацоўваюцца тэхнічныя навыкі харэаграфічнага выканальніцтва, развіваецца артыстычнасць, набываюцца навыкі стварэння і пастаноўкі вучэбных камбінацый і эцюдаў, а таксама вядзення рэпетыцыйнай работы, адпрацоўваецца методыка вывучэння асобных рухаў і правядзення ўрока класічнага танца, ідзе праца над развіццём мастацкага густу і поўным раскрыццём музыкальных і харэаграфічных здольнасцей і ведаў студэнтаў.

На індывідуальных занятках, якія праводзяцца ва ўсіх семестрах, замацоўваюцца веды па методыцы вывучэння асобных рухаў і камбінацый класічнага танца, вывучаюцца літаратура і відэаматэрыялы.

Вучэбны курс прадугледжвае значную частку самастойнай працы над развіццём індывідуальных фізічных даных, валоданнем тэхнікай і артыстызмам выканання харэаграфічнага матэрыялу, метадамі і прыёмамі пастановачнай і рэпетыцый-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

най працы. Таксама вывучаюцца дадатковая літаратура і відэаматэрыялы. Факультатыўна адпрацоўваюцца рухі, якія патрабуюць высокай выканальніцкай тэхнікі. Пры наяўнасці ў студэнтаў неабходных даных факультатыўна могуць вывучацца рухі на пальцах.

На працягу курса прадугледжаны разнастайныя формы кантролю, завяршаецца курс экзаменам.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен *ведаць*:

– асноўную тэрміналогію класічнага танца;

– методыку вывучэння і выканання рухаў класічнага танца;

– педагагічную сістэму А.Я.Ваганавай;

– асноўныя патрабаванні да класічнага танца;

– прынцыпы падбору музычнага матэрыялу для ўрокаў класічнага танца;

– прынцыпы музычнага выхавання і развіцця музыкальнасці на ўроках класічнага танца;

– методыку пабудовы і правядзення ўрока класічнага танца ў калектывах рознай накіраванасці (народнага, эстраднага, бальнага танца і інш.) і для розных узроставых катэгорый;

*умець:*

– выконваць асноўныя рухі класічнага танца;

– граматна і прафесійна падыходзіць да вывучэння школы класічнага танца;

– улічваць спецыфіку правядзення ўрока класічнага танца ў калектывах рознай накіраванасці і розных узроставых катэгорый;

– развіваць у выканаўцаў навыкі валодання лексікай класічнага танца;

– развіваць творчыя здольнасці ўдзельнікаў танцавальных калектываў сродкамі класічнага танца;

– супрацоўнічаць з канцэртмайстрам пры падборы музычнага матэрыялу.

Тыпавым вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны “Класічны танец” прадугледжана 840 гадзін, у тым ліку 386 гадзін аўдыторных заняткаў. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: для напрамкаў спецыяльнасці “Харэаграфічнае мастацтва (народны танец), (эстрадны танец)” – 40 гадзін – лекцыі, 296 гадзін – лабараторныя, 50 гадзін – індывідуальныя; для напрамку спецыяльнасці “Харэаграфічнае мастацтва (бальны танец)” – 40 гадзін – лекцыі, 286 гадзін – лабараторныя, 60 гадзін – індывідуальныя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Назвы тэм | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Напрамак спецыяльнасці 1-17 02 01-05 Бальны танец | | | Напрамкі спецыяльнасці 1-17 02 01-04 Народны танец 1-17 -2 01-06 Эстрадны танец | | |
| | лекц. | практ. | інд. | лекц. | лаб. | інд. |
| Уводзіны | 2 | | | 2 | | |
| **Раздзел I. Сістэма класічнага танца** | | | | | | |
| ***Тэма 1.*** Фарміраванне і развіццё сістэмы класічнага танца. Асноўныя патрабаванні класічнага танца | 6 | | 2 | 6 | | 2 |
| ***Тэма 2***. Роля А.Я.Ваганавай у развіцці школы класічнага танца | 2 | | 2 | 2 | | 2 |
| ***Тэма 3.*** В.Кастравіцкая, А.Пісараў, Н.Базарава, В.Мей, А.Месэрэр, М.Тарасаў, А.Пушкін, А.Ермалаеў і іх уклад у развіццё школы класічнага танца. Аналіз літаратуры па методыцы выкладання класічнага танца | 10 | | 2 | 10 | | 2 |
| **Раздзел II. Сучасны ўрок класічнага танца** | | | | | | |
| ***Тэма 4.*** Методыка пабудовы ўрока класічнага танца | 2 | 20 | 4 | 2 | 20 | 4 |
| ***Тэма 5***. Развіццё музыкальнасці на ўроку класічнага танца. Музычнае суправаджэнне ўрока | 8 | 20 | 8 | 8 | 20 | 4 |
| ***Тэма 6***. Праца педагога ў класе. Урок класічнага танца ў калектывах розных жанраў | 10 | 10 | 4 | 10 | 10 | 4 |
| **Раздзел III. Методыка выканання рухаў класічнага танца** | | | | | | |
| ***Тэма 7***. Элементарныя рухі класічнага танца | | 64 | 8 | | 64 | 8 |
| ***Тэма 8.*** Позы і танцавальныя шагі | | 62 | 10 | | 62 | 8 |
| ***Тэма 9.*** Скачкі і заноскі | | 50 | 10 | | 60 | 8 |
| ***Тэма 10.*** Павароты і вярчэнні | | 60 | 10 | | 60 | 8 |
| **Усяго…** | **40** | **286** | **60** | **40** | **296** | **50** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## *Уводзіны*

Азнаямленне з мэтамі і задачамі курса “Класічны танец”. Класічны танец як універсальная сістэма падрыхтоўкі выканаўцаў у галіне харэаграфічнага мастацтва. Патрабаванні да студэнта на ўроку класічнага танца.

## Раздзел I. Сістэма класічнага танца

### *Тэма 1. Фарміраванне і развіццё сістэмы класічнага танца. Асноўныя патрабаванні класічнага танца*

Першаасновa стварэння сістэмы класічнага танца – народная харэаграфія. Узбагачэнне класічнага танца танцавальным фальклорам розных народаў.

Выразныя сродкі класічнага танца.

Зараджэнне і развіццё школы і сістэмы класічнага танца. С.О.Вестріс, К.Блазіс, А.Бурнанвіль. Французская і італьянская школы класічнага танца.

Стварэнне рускай школы класічнага танца. Адметныя рысы рускай школы, яе выканальніцкага майстэрства (А.Санкоўская, А.Андрэянава, А.Глушкоўскі, Ш.Дзідло).

Развіццё і ўзбагачэнне тэорыі і методыкі выкладання класічнага танца.

Вываратнасць, яе фізіялагічныя асновы і эстэтычныя функцыі. Вываратнасць як асноўнае патрабаванне пры выкананні рухаў класічнага танца.

Пастава ў класічным танцы. Эстэтычныя функцыі паставы.

Апломб у класічным танцы.

Plié ў класічным танцы.

Рухомасць суставаў, пластыка і гібкасць цела як сродкі выразнасці выканаўцы.

Танцавальны шаг. Шаг пасіўны, актыўны, статычны.

Скачок у класічным танцы. Асаблівасці выканання скачкоў у жаночым і мужчынскім танцы.

Класічны танец і музыка. Музыкальнасць танцоўшчыка.

Прыёмы развіцця асноўных патрабаванняў классічнага танца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Тэма 2. Роля А.Я.Ваганавай у развіцці айчыннай школы класічнага танца***

Новая методыка выкладання класічнага танца, увабраўшая ў сябе ўсё лепшае з айчыннай школы класічнага танца.

Стварэнне тэорыі класічнага танца, спалучэнне тэорыі і практыкі. Сістэматызацыя рухаў класічнага танца.

Асноўная тэарэтычная праца А.Я.Ваганавай – падручнік “Асновы класічнага танца”.

Педагагічныя прыёмы А.Я.Ваганавай.

***Тэма 3. В.Кастравіцкая, А.Пісараў, Н.Базарава, В.Мей, А.Месэрэр, М.Тарасаў, А.Пушкін, А.Ермалаеў і іх уклад у развіццё школы класічнага танца. Аналіз літаратуры па методыцы выкладання класічнага танца***

Структура і змест падручнікаў і вучэбна-метадычных дапаможнікаў, іх мэты і задачы, прымяненне ў вучэбным працэсе.

“Асновы класічнага танца” А.Я.Ваганавай.

“Класічны танец” М.І.Тарасава.

“Азбука класічнага танца” Н.Базаравай, В.Мей.

“Школа класічнага танца” В.Кастравіцкай, А.Пісарава.

Асаблівасці педагагічнай дзейнасці А.Пушкіна. Уклад у развіццё школы мужчынскага танца. Яго лепшыя вучні – М.Барышнікаў, Р.Нурыеў.

Спецыфіка пабудовы ўрока класічнага танца ў класе ўдасканалення А.Месэрэра. “Клас-канцэрт” з удзелам У.Васільева, К.Максімавай, М.Плісецкай, М.Ліепы і інш.

А. Ермалаеў і асаблівасці яго педагагічных прыёмаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел ІІ. Сучасны ўрок класічнага танца

***Тэма 4. Методыка пабудовы ўрока класічнага танца***

Задачы ўрока класічнага танца.

Тэрміналогія класічнага танца.

Паслядоўнасць выканання экзерсісу ля станка і на сярэдзіне зала.

Суразмернасць працягласці частак урока. Тэмп урока.

Методыка вывучэння рухаў і складання камбінацый у адпаведнасці з праграмай практычнага курса:

– назва руху, вымаўленне, пераклад;

– паказ руху, яго назначэнне, характар руху;
– характар музычнага суправаджэння;
– правілы выканання ў спалучэнні з музычнай раскладкай;
– асноўныя этапы вывучэння, магчымыя спалучэнні з іншымі рухамі і паступовае ўскладненне выканання (адпаведна пэўнаму курсу навучання);
– прыклады найбольш распаўсюджаных памылак у выкананні рухаў і іх папярэджванне.

***Тэма 5. Развіццё музыкальнасці на ўроку класічнага танца. Музычнае суправаджэнне ўрока***

Паняцці рытму, метру, тэмпу, музычнай дынамікі.

Мелодыя і яе мастацкае ўвасабленне ў танцавальных камбінацыях.

Стварэнне і выкананне асобных камбінацый у адпаведнасці са структурай і характарам музычнага твора.

Стварэнне танцавальных камбінацый на прапанаваныя музычныя прыклады.

Роля музычнага суправаджэння на ўроку класічнага танца.

Праслухоўванне і аналіз музычных прыкладаў. Падбор музычных прыкладаў з улікам узроставых асаблівасцей вучняў і характару танцавальных рухаў.

Адпаведнасць стылю і характару выконваемага руху музычнаму матэрыялу.

Самастойнае праслухоўванне і адбор музычнага матэрыялу для суправаджэння рухаў і камбінацый.

***Тэма 6. Праца педагога ў класе. Урок класічнага танца ў калектывах розных жанраў***

Авалоданне харэаграфічнай выканальніцкай тэхнікай і яе развіццё, набыццё ведаў аб музыцы і руху, фарміраванне сістэмы поглядаў на мастацтва харэаграфіі – асноўны змест харэаграфічнай адукацыі.

Задачы педагога. Дыдактыка. Асноўныя метады навучання ў харэаграфічным мастацтве.

Індывідуальны падыход да вучняў – галоўны прынцып псіхалогіі і педагогікі ўвогуле, харэаграфічнай педагогікі ў прыватнасці.

Этапы падрыхтоўкі выкладчыка да правядзення ўрока класічнага танца. Вучэбная праграма па спецыяльнасці. Каляндарны план. План урока класічнага танца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел III. Методыка выканання рухаў класічнага танца

***Тэма 7. Элементарныя рухі класічнага танца***

Пазіцыі ног.

Plié.

Relevé на паўпальцы.

*Battements*: battement tendu; battement tendu jeté; battement tendu pour batterie; battement relevé lent; grand battement jeté; battement frappé; petit battement sur le cou-de-pied; battement battu; battement fondu; battement soutenu; battement développé.

*Rond de jambe:* rond de jambe par terre; rond de jambe en l'air; grand rond de jambe en l'air; grand rond de jambe jeté.

Temps relevé.

Flic-flac.

Пазіцыі рук.

*Port de bras:* I – VI формы port de bras.

***Тэма 8. Позы і танцавальныя шагі***

*Позы:*

малыя позы;

позы arrondié;

позы allongée;

сярэднія позы;

вялікія позы.

*Танцавальныя шагі:*

хада і бег;

паклон;

pas degagé;

pas tombé;

pas coupe;

pas glissé;

pas faille;

pas de bourrée;

pas balancé;

pas couru;

temps lié.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**_Тэма 9. Скачкі і заноскі_**

*Скачкі з дзвюх ног на дзве нагі*: temps sauté; changement de pied; soubresaut; pas echappé.

*Скачкі з дзвюх ног на адну:* sissonne simple; sissonne tombée; sissonne ouverte; sissonne fermée; pas pailli; rond de jambe en l'air sauté.

*Скачкі з адной нагі на дзве*: pas assemblé.

*Скачкі з адной нагі на другую:* pas jeté; pas glissade; pas chassé; pas de chat; pas de basque; pas de ciseaux; pas emboité; pas ballotté; pas coupé.

*Скачкі на адной назе*: temps levé; pas ballonné; rond de jambe en l'air sauté; cabriole.

*Заноскі (batteries):* entrechats; royal; entrechat trios; entrechat quatre; entrechat cing; entrechat six; pas battus; brisé.

**_Тэма 10. Паварoты і вярчэнні_**

*Павароты на падлозе.*

*Элементарныя рухі ў павароце*: battement tendu; grand battement jeté; battement développé; rond de jambe par terre; rond de jambe en l'air; grand rond de jambe; battement soutenu; battement frappe; battement fondu; flic-flac; battements divisés en quarts (чацвяртныя батманы).

*Позы ў павароце:* tour fouetté; grand fouetté; павароты renversé.

Танцавальныя шагі ў павароце: pas degage; pas glissé; pas tombé; pas de bourrée; pas balancé.

*Рухі вярчэння на падлозе.*

*Піруэты (Les pirouettes).*

*Малыя піруэты:* піруэт з II пазіцыі, піруэт з IV пазіцыі, піруэт з V пазіцыі, піруэт з grand jeté; піруэт з petit temps relevé; піруэт з малой ці вялікай позай; піруэт з pas tombé; піруэт з pas jeté; піруэт з pas coupé; піруэты fouetté на 45º; піруэт tir-bouchon.

*Паўпіруэты*: паўпіруэт з pas coupe; паўпіруэт з pas tombé; pas emboité; pas jeté з прасоўваннем убок па паўпіруэта; tours chainés.

*Вялікія піруэты:* піруэт a la second; піруэты ў attitude; піруэты ў arabesque; піруэты ў позу з раскрытай нагой уперад на 90º.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вялікія паўпіруэты.*

*Павароты і вярчэнні ў паветры:*

*Скачкі з паваротам:* temps sauté з паваротам; changement de pied з паваротам; pas echappé з паваротам; sissonne simple з паваротам; sissonne tombée з паваротам; sissonne ouverte par développé; sissonne ouverte par jeté; pas assemblé з паваротам; petit pas jeté з паваротам; pas emboité з паваротам; pas jeté з прасоўваннем убок на 1/2 круга; saut de basque; pas chassé з паваротам; grand pas jeté з паваротам; grand jeté fouetté; перакіднoе jeté; temps levé simple з паваротам; temps levé tombé з паваротам; temps levé ў позах з паваротам; temps levé з адной позы ў другую з паваротам; renversé; revoltade.

*Вярчальныя рухі ў паветры*: tours en l'air з V пазіцыі ў V; tours en l'air прыёмам sissonne simple; tours en l'air прыёмам sissonne tombée; tours en l'air прыёмам sissonne ouverte.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА


*Асноўная*

1. *Базарова, Н.* Азбука классического танца / Н.Базарова, В.Мей. – Л.: Искусство, 1983. – 200 с.
2. *Базарова, Н.* Классический танец / Н.Базарова. – Л.: Искусство, 1975. – 204 с.
3. *Ваганова, А.Я.* Основы классического танца / А.Я.Ваганова. – Л.: Искусство, 1980. – 177 с.
4. *Головкина, С.* Уроки классического танца в старших классах / С.Головкина. – М.: Искусство, 1989. – 150 с.
5. *Костровицкая, В.* Школа классического танца / В.Костровицкая, А.Писарев. – Л.: Искусство, 1986. – 271 с.
6. *Костровицкая, В.* 100 уроков классического танца / В.Костровицкая. – Л.: Искусство, 1972. – 239 с.
7. *Лысенкова, В.* Классический танец / В.Лысенкова. – Мозырь: Белый ветер, 2000. – 472 с.
8. *Мессерер, А.* Уроки классического танца / А.Мессерер. – М.: Искусство, 1967.
9. *Тарасов, Н.* Классический танец / Н.Тарасов. – М.; Л.: Музыка, 1966. – 552 с.
10. *Ярмолович, Л.* Принципы музыкального оформления урока классического танца / Л.Ярмолович. – М.: Искусство, 1968. – 68 с.

*Дадатковая*

1. *Блок, Л.Д.* Классический танец. История и современность / Л.Д.Блок. – М.: Искусство, 1987. – 556 с.
2. *Ванслов, В.* Балеты Григоровича и проблемы хореографии / В.Ванслов. – М.: Искусство, 1971. – 300 с.
3. *Ермолаев, А.* Сборник статей / А.Ермолаев. – М.: Искусство, 1974. – 229 с.
4. *Кремшевская, Г.* Агриппина Ваганова / Г.Кремшевская. – Л.: Искусство, 1981. – 136 с.
5. *Суриц, Е.* Всё о балете / Е.Суриц. – М.; Л.: Музыка, 1966. – 552 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**КЛАСІЧНЫ ТАНЕЦ**

*Тыпавая вучэбная праграма для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасці 1-17 02 01 Харэаграфічнае мастацтва (па напрамках)*

*Напрамкі спецыяльнасці*
*1-17 02 01 04 Харэаграфічнае мастацтва (народны танец)*
*1-17 02 01 05 Харэаграфічнае мастацтва (бальны танец)*
*1-17 02 01 06 Харэаграфічнае мастацтва (эстрадны танец)*

Рэдактар В.В.Каташвілі
Тэхнічны рэдактар Л.М.Мельнік

Падпісана ў друк 2010 г. Фармат 60x84$^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 0,81. Ул.-выд. арк. 0,49.
Тыраж экз. Заказ .

УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”.
220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17.
Ліцэнзія № 02330/0131818 ад 02.06.2006 г.

Надрукавана на рызографе
УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”.
220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб'яднанне вышэйшых навучальных устаноў
Рэспублікі Беларусь па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# КЛАСІЧНЫ ТАНЕЦ

*Тыпавая вучэбная праграма для вышэйшых навучальных устаноў*
*па спецыяльнасці 1-17 02 01 Харэаграфічнае мастацтва (па напрамках)*

*Напрамкі спецыяльнасці*
*1-17 02 01 04 Харэаграфічнае мастацтва (народны танец)*
*1-17 02 01 05 Харэаграфічнае мастацтва (бальны танец)*
*1-17 02 01 06 Харэаграфічнае мастацтва (эстрадны танец)*

Мінск 2010

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ